УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ СМАРГОНСКАГА РАЙВЫКАНКАМА
ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“ЯСЛІ-САД № 10 Г. СМАРГОНІ”



РАЁННЫ ФЕСТЫВАЛЬ ПЕДАГАГІЧНАГА ВОПЫТУ
" УСЕ ГРАНІ МАЙСТЭРСТВА"

КОНКУРС " СЁННЯ ЧАМУЧКІ-ЗАЎТРА ВЫНАХОДНІКІ"

# “Вада – самы вялікі цуд на зямлі”

***Канспект***

**Аўтар работы:**
**Вяршковіч Вольга Сяргееўна,**
**выхавальнік дашкольнай**
**адукацыі**

# ВАДА – САМЫ ВЯЛІКІ ЦУД НА ЗЯМЛІ
## Занятак па адукацыйнай галіне «Дзіця і прырода» для выхаванцаў старшай групы (5-6 гадоў)

**Праграмныя задачы:** фарміраваць уяўленні аб прыродных рэсурсах, неабходных чалавеку (вада) і неабходнасці яе беражлівага выкарыстання; замацоўваць уяўленні пра адметныя прыкметы аб’ектаў і з’яў нежывой і жывой прыроды; развіваць уменні заўважаць аб’екты і з’явы нежывой прыроды і іх уласцівасці ў прыродзе і штодзённым жыцці (агрэгатныя станы вады: вадкі, цвёрды, газападобны); развіваць увагу, лагічнае мысленне, цікавасць да эксперыментавання, уменне разважаць і рабіць вывады; выхоўваць адказнасць за стан прыроды бліжэйшага акружэння.

**Матэрыял і абсталяванне:** карта, бінокль, церамок, карткі з малюнкамі прадметаў, пластыкавыя шклянкі для доследаў, тэрмас, люстэрка, шклянка з кубікамі лёду, талерка для лёду, халаты, аднаразавыя шапачкі, аднаразавыя пальчаткі, разразныя малюнкі снегавіка, крынічкі, чайніка з парай, ілюстрацыі з выявамі правільнага і няправільнага абыходжання з вадой, малюнкі з сітуацыямі, што паказваюць правілы беражлівага выкарыстання вады, два куфэркі, карона, рознакаляровыя накідкі.

**Папярэдняя работа**: назіранне за снегам, лёдам; выраб каляровага лёду ў формачках; загадванне загадак; гутарка пра карысць вады, беражлівае стаўленне да яе; вопыты з вадой; гутаркі пра адметныя прыкметы аб’ектаў і з’яў нежывой і жывой прыроды; дыдактычныя гульні па тэме.

### Ход занятку

**Выхавальнік (В.)** Праходзьце, дзеці. Пачнём наш дзень з усмешкі. Моцна за рукі вазьміцеся і адзін аднаму ўсміхніцеся.

**В.** Адгадайце, калі ласка, загадку.

Гэта мора і рака,
І ручай, і хмара.
Можа капаць, можа ліць
Без яе нам не пражыць. (*Вада)*

Ці здагадаліся вы, пра што мы сёння будзем весці размову? (*Пра ваду)*.

**В.** У мяне ёсць карта марскога падарожжа, падарожжа па вадзе. Жадаеце адправіцца са мной у падарожжа? (*Так!)* Тады заплюшчыце вочкі і скажыце: «1, 2, 3, павярніся і на беразе мора апыніся».

**В.** Вось і апынуліся мы на марскім пабярэжжы. А падарожнічаць будзем на параходзе. Мы будзем шукаць адказ на пытанне: «Ці можна назваць ваду самым вялікім цудам на Зямлі?»

**Назаві прыкметы**

**В.** Скажыце, калі ласка, вада – гэта аб’ект жывой ці нежывой прыроды? (*Нежывой).* Назавіце прыкметы, якімі адрозніваюцца аб’екты і з’явы нежывой і жывой прыроды (*Адказы дзяцей).*

**Назаві аб’ект нежывой прыроды**

**В.** Каб заняць месца на параходзе, трэба назваць аб’ект нежывой прыроды (*Адказы дзяцей, займаюць свае месцы).*

*Гучыць гуказапіс (шум вады пры руху на параходзе)*

**Гульня “Церамок”**

**В.** Першы востраў называецца “Церамок”. Пад якой ён лічбай? (*1*).

*Выхавальнік дашкольнай адукацыі прапануе дзецям узяць па аднаму малюнку, на якіх намаляваныя дрэва, вярблюд, рыбка, ракі, чалавек і г.д.)*.

**В.** Я вада. Я пушчу цябе ў церамок, калі ты скажаш, як ты звязаны са мной.

Я – дрэва, я не магу расці без вады.

Я – вярблюд, пасля паходу па пустыні я магу выпіць 10 вёдзер вады і г.д.

**В.** Ці можам мы назваць ваду цудам? *(Да!)* Чаму? (*Таму што без вады не могуць жыць ні людзі, ні жывёлы, ні расліны*).

**Правядзенне доследаў**

**В.** Наступны востраў ***«Лабараторыя».*** Пад якой ён лічбай? *(2).*

**В.** На гэтым востраве мы з вамі на некаторы час станем навукоўцамі-даследчыкамі. Ці ведаеце вы, што такое лабараторыя? *(Адказы дзяцей).* Як вы думаеце, як патрэбна паводзіць сябе ў лабараторыі? (*Адказы дзяцей).* Так, у лабараторыі павінна быць строгая дысцыпліна, асцярожнасць і парадак; нельга піхацца, перашкаджаць адзін аднаму, гучна размаўляць. У лабараторыі мы будзем вывучаць станы вады. Першы дослед мне дапаможа праводзіць Агата. Для яго правядзення неабходна надзець халат, шапачку і пальчаткі.

**Дослед 1**. *Дзяўчынка пералівае ваду са шклянкі ў шклянку.*

**В.** Што робіць Агата? Чаму яна змагла пераліць ваду? (*Адказы дзяцей*). Які вывад мы можам зрабіць? *Першы стан вады - яна вадкая, яе можна пераліць.*

**Дослед 2.**

**В.** **(***Паказвае дзецям тэрмас).* Што гэта за сасуд? Як ён называецца? Для чаго ён патрэбен? Што можа быць у гэтым тэрмасе? Давайце адчынім яго. Што мы бачым над тэрмасам? (*Падымаецца пара*). Дзеці, можа быць, замест вады ў тэрмасе была пара? (*Адказы дзяцей*). Давайце дакажам, што

пара – гэта вада! Для гэтага возьмем люстэрка і патрымаем над парай. Што вы бачыце на люстэрку? (*Выступілі кропелькі вады*). Які мы з гэтага можам зрабіць вывад? (*Пара – гэта адзін са станаў вады – газападобны).* Як вы думаеце, а што такое воблака, туман? (*Таксама пара*).

**Дослед 3.**

**В.** Трэці дослед мне дапаможа праводзіць Арсеній. Паглядзіце, што ў яго ў шклянцы? (*Кубікі лёду*). З чаго яны зроблены? (*З вады).* Як даказаць – што лёд – гэта вада? (*Адказы дзяцей*). Так, для гэтага мы пакладзём лёд у талерку, а самі крышку адпачнём (*Хлопчык перакладае кубікі лёду ў талерку).*

**Фізкультмінутка**

На свеце кропелька жыла,
(*Злучаюць указальны і вялікі пальцы абедзвюх рук).*
Сябравала з воблакам яна,
(*Бяруцца за рукі*).
На ім скакала і гуляла
З такімі ж як сама.
(*Размахваюць рукамі, трымаючыся за рукі*).
Ды вецер воблака панёс
У далёкія краіны.
(*Бягуць на месцы).*
І стала кропелька расці
(*Абхопліваюць сябе рукамі*).
І з воблака саскочыла.
(*Прысядаюць*).
І сталі кропелькі дажджом,
І на зямлю праліліся.
*(Стукаюць па падлозе пальцамі рук*).
Пабеглі па зямлі вясёлым ручаём,
У вялікія рэкі ўліліся.
*(Бягуць адзін за адным).*
Прыгрэла сонейка ярчэй,
І стала нашай кропельцы лягчэй.
*(Перакрыжоўваюць далоні рук, імітуючы прамені сонца).*
Высока ў неба паднялась
*(Падымаюць рукі ўверх*).
І стала кропляй пары, немаўляткай.
*(Злучаюць пальцы правай рукі).*
І зноў адправілась у шлях,
Каб паўтарыць усё спачатку
(*Крочаць на месцы*).

**В.** Аб якіх двух станах вады мы даведаліся з гэтага верша? (*Вадкі і газападобны).* А зараз працягнем наш дослед. Паглядзіце, што здарылася з нашымі кавалачкамі лёду? (*Яны сталі меншымі, на талерачцы з'явілася вада).* Скажыце лёд які? (*Халодны, цвёрды).* А якім ён становіцца ў цяпле? (*Вадкім, ён тае).* Які мы з гэтага можам зрабіць вывад? (*Лёд – гэта цвёрды стан вады).* Якія яшчэ цвёрдыя станы вады вы ведаеце? *(Снег, град).* Ці можам мы назваць ваду цудам? *(Так!).* Чаму? (*Пры награванні вада ператвараецца ў пар; лёд і снег пры награванні ператвараецца ў ваду).*

***Адгадай загадку і назаві стан вады***

**В.** Наступны востраў «Адгадай загадку». Пад якой ён лічбай? *(3).* Якія вы ведаеце станы вады? *(Цвёрды, вадкі, газападобны).*

*Дзеці адгадваюць загадкі і называюць які гэта стан вады.*

З хмаркі спрыгнуў, зачасціў,
Усю зямлю ён прамачыў,
Напаіў лясы, сады,
Кветкі, поле і лугі. *(Дождж)*

Белыя гарошкі
Скачуць па дарожцы.
Круглыя, халодныя
Таюць на далоньцы. *(Град)*

Над ракою і далінай
Срэбна-белаю хусцінай
Разаслаўся белы дым
І не бачна, што з ім. *(Туман)*

Паглядзіце на карніз
Што расце не ўверх, а ўніз?
Морква белая вісіць
І на сонейку блішчыць. *(Лядзяш)*

Без дошак, без тапароў
Цераз рэчку мост гатоў.
Мост – як сіненькае шкло:
Вельмі слізкае яно. *(Лёд)*

Цэлы востраў ледзяны
Плавае туды-сюды.
Гэты востраў, о-ё-ёй
Большай часткай пад вадой. *(Айсберг)*

**В.** Малайцы! Ці можам мы назваць ваду цудам? *(Так!)*

**Гульня "Складзі карцінку з частак»**

**В.** Наступны востраў ***«Складзі карцінку з частак».*** Пад якой ён лічбай? *(4).*

*(Дзеці дзеляцца на 3 каманды. Уддзельнікі каманд збіраюць разразныя малюнкі снегавіка, крынічкі, чайніка з парай).*

**В.** Якія станы вады атрымаліся? *(Адказы дзяцей).* Ці можам мы назваць ваду цудам? *(Так!).* Чаму? (*Адказы дзяцей*).

**Назаві правілы беражлівага выкарыстання вады**

**В.** Востраў ***«Правілы беражлівага выкарыстання вады»***. Пад якой лічбай востраў? *(5).*

*Дзеці з малюнкамі, на якіх намаляваныя сітуацыі, што паказваюць правілы беражлівага выкарыстання вады, выходзяць да дошкі і расказваюць вершы.*

Для чаго цячэ вада
Дні і ночы, як з вядра.
Трэба кран рамантаваць,
Ваду трэба зберагаць!

Вось пад душам мыюсь я,
Не патрэбна ванная.
Кантралюем мы расход –
Менш заплацім мы за год!

Кавун, дыню, агурок
Трэба ў місцы мыць, дружок.
А пад кранам апаласні,
Калі ўжо вымыты яны.

Вельмі важна, дзеці, вам
Зубы чысціць вечарам.
Ваду ў шклянку набірай,
Кран часцей ты зачыняй!

**В.** Як мы можам зберагаць ваду? (*Адказы дзяцей).*

**Знайдзі карцінку, дзе намалявана няправільнае абыходжанне з вадой**

**В.** Востраў ***«Няправільнае абыходжанне з вадой».*** Пад якой лічбай востраў? *(6).*

**В.** Заданне: пастаў чырвоны кружок насупраць карцінкі, дзе намалявана няправільнае абыходжанне з вадой.

- Будаўніцтва ачышчальных збудаванняў.
- Скідванне ў ваду адходаў заводаў.

- Пасадка дрэў па берагах вадаёмаў.
- Паласканне бялізны ў рэчцы.
- Мыццё машын каля вадаёмаў.
- Выкідванне ў ваду смецця або пакіданне яго на беразе.

**В.** Як вы думаеце, што можа здарыцца з вадой, калі мы не будзем яе берагчы, будзем няправільна з ёй абыходзіцца? (*Адказы дзяцей*).

**Казка пра ваду – самы вялікі цуд на зямлі**

**В.** Востраў ***«Экалагічная казка»***. Пад якой ён лічбай? *(7).*

*Выхавальнік кажа словы за аўтара, дзеці за сыноў і цара.*

Жыў-быў цар. І было ў яго тры сыны. Сабраў цар аднойчы сваіх сыноў і загадаў ім прынесці ЦУД. Старэйшы сын прынес золата і срэбра, сярэдні сын – каштоўныя камяні, малодшы сын прынёс звычайную ваду.

Сталі над малодшым сынам усе смяяцца, а ён кажа:

Вада – самы вялікі цуд на зямлі. За глаток вады гатоў быў аддаць усё сваё золата чалавек, які паміраў у пустыні без вады. Зразумеў я тады, што вада даражэй усякага багацця.

Другі раз я бачыў, як ад засухі высахла цэлае поле. Ажывіў поле толькі дождж.

А трэці раз я дапамагаў лясны пажар тушыць. Толькі вада змагла спыніць злы агонь.

А зараз я думаю, што і вы ўсе зразумелі, што вада – самы вялікі цуд, бо без яе не было б нічога жывога на Зямлі.

А яшчэ вада мае чароўную сілу ператварацца ў лёд і пару.

Паслухаў цар малодшага сына і аб’явіў ваду самым вялікім цудам на Зямлі. Загадаў ён ваду берагчы, вадаёмы і рэкі не забруджваць.

**В.** Чаму цар аб’явіў ваду самым вялікім цудам на Зямлі? (*Адказы дзяцей).* Вось і скончылася наша падарожжа. Нам пара назад у дзіцячы сад. Давайце станем у круг і скажам: «1, 2, 3, павярніся і ў дзіцячым садзе апыніся». (*Дзеці выконваюць).* Мы зноў у дзіцячым садзе. Давайце ўспомнім, дзе мы былі, пра што вялі размову, да якога выніку прыйшлі. (*Адказы дзяцей*). А напрыканцы давайце пажадаем адзін аднаму дабра.

Мы далоньку ў далоньку паклалі,
І мы сябру дабра пажадалі.
Будзем пецъ і займацца, гуляць,
Каб разумнымі, добрымі стаць.

Літаратура:

1. Ладутько, Л.К., Шкляр, С.В. Природа в развитии и воспитании детей дошкольного возраста. От 5 до 6 лет / Л.К. Ладутько, С.В. Шкляр. – Минск : Аверсев, 2016.

2. Лобынько, Л.В., Швецова, Т.Ю. Современные подходы к процессу образования старших дошкольников / Л.В. Лобынько, Т.Ю. Швецова . – Минск : ИВЦ Минфина, 2015.

3. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі. – Мінск : Нац. Ін-т адукацыі, 2019